**Л.А.Дзямешка,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
**С.В.Зыгмантовіч,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# ГІСТОРЫЯ КАФЕДРЫ МЕНЕДЖМЕНТУ ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНАЙ СФЕРЫ Ў КАНТЭКСЦЕ РЭАЛІЗАЦЫІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ФУНКЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вышэйшая бібліятэчная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь бярэ пачатак з 1944 г. Менавіта ў гэтым годзе пры Мінскім педагагічным інстытуце (зараз Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка) была адкрыта кафедра бібліятэказнаўства, на аснове якой пазней быў заснаваны бібліятэчны факультэт.

Узначаліў кафедру бібліятэказнаўства і кіраваў ёю на працягу дзевяці гадоў (1944–1952) выдатны бібліятэказнавец і бібліёграф, дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі) Іосіф Бенцыянавіч Сіманоўскі. Менавіта ён сфарміраваў падмурак кафедры, быў першым на ёй выкладчыкам і навукоўцам, меў вялікі аўтарытэт у бібліятэчным свеце.

Паступова вызначыўся пастаянны штат выкладчыкаў. Першыя публікацыі супрацоўнікаў кафедры адносяцца да 50–60-х гг. ХХ ст. і знаходзяць адлюстраванне на старонках расійскага часопіса “Библиотекарь”, а таксама “Учёных записок” Мінскага педагагічнага інстытута; змяшчаюцца ў зборніках матэрыялаў навуковых і навукова-практычных канферэнцый. Аб развіцці бібліятэчнай справы ў Беларусі расказаў І.Б.Сіманоўскі ў дакладзе “Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской революции” на навуковай канферэнцыі ў Маскве (1957) [1].

Навукова-даследчая дзейнасць кафедры набывае больш сістэматычны характар у 60-я – пачатку 70-х гг. У гэты час з яе складу вылучаецца кафедра бібліяграфіі, штаты кафедраў папаўняюцца супрацоўнікамі з вучонымі ступенямі. Выкладчыкі кафедраў атрымалі магчымасць публікаваць навуковыя працы на старонках міжведамаснага зборніка “Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства”, прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы,

выданні і рэцэнзаванні чатырох даведнікаў пад агульнай назвай “Бібліятэчная справа на Беларусі. Дакументы і матэрыялы” (І – 1918–1941; ІІ – 1941–1958; ІІІ – 1959–1975; ІV – 1976–1990).

Новы этап у развіцці кафедры бібліятэказнаўства звязаны з адкрыццём Мінскага інстытута культуры (1975), у сувязі з чым кафедра становіцца на бібліятэчным факультэце вядучай. Пашыраецца дыяпазон навуковых прац, выдаюцца манаграфіі “Савецкі рабочы-чытач”, “Савецкі селянін-чытач” (аўтар Л.І.Пятровічава), “Інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі” (аўтар Л.А.Дзямешка), “Роля бібліятэкі ПТВ у прафесійным і духоўным станаўленні маладых рабочых” (аўтар Н.У.Клімянкова); дэпаніруецца зборнік кафедры “Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь: здабыткі і перспектывы” (2001).

Вялікую дапамогу студэнтам і бібліятэкарам аказалі слоўнікі па бібліятэказнаўстве і бібліяграфазнаўстве, выдадзеныя ў 1992 г. (аўтары В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка) і ў 2003 г. (аўтары В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.А.Саматыя) [2].

З адкрыццём аспірантуры па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства” і спецыялізаванага савета па абароне дысертацый пры інстытуце (1989) кафедра актывізавала падрыхтоўку навукова-педагагічных кадраў. За час існавання савета абаранілі кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфія” аспіранткі Л.І. Ракавецкая на тэму “Тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнага менеджменту” (навуковы кіраўнік дацэнт Л.І.Дзямешка); А.М.Багарэвіч “Інфармацыйныя патрэбнасці чытачоў як фактар фарміравання фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі” (навуковы кіраўнік дацэнт Н.У.Клімянкова); Н.Я.Петушка “Бібліятэчнае абслугоўванне інвалідаў па зроку: тэарэтыка-метадычны аспект” (навуковы кіраўнік дацэнт У.А.Акуліч); Хадад Набіль (Сірыя) “Каталагізацыя дакументаў і асаблівасці яе развіцця і прымянення ў бібліятэках Сірыі” (навуковы кіраўнік дацэнт Н.А.Ляйко); Салех Кайс (Сірыя) “Універсітэцкая бібліятэка ў сістэме абслугоўвання навукова-даследчай і вучэбнай дзейнасці выкладчыкаў” (навуковы кіраўнік дацэнт Н.У.Клімянкова).

З мэтай навуковага і вытворчага супрацоўніцтва кафедра заключае дагаворы і наладжвае кантакты з замежжам: Сафійскім і Вяліка-Тырнаўскім універсітэтамі (Балгарыя), Варшаўскім і Ягелонскім універсітэтамі, Вышэйшай педагагічнай школай Ольштына (Польшча), Вышэйшай школай бібліятэчнай і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнай справы ў Штутгарце (Германія), Дагестанскім універсітэтам, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Нідэрландаў. Вынікамі супрацоўніцтва з'яўляюцца выязная вытворча-азнаямляльная практыка студэнтаў у гэтыя краіны, стажыроўка выкладчыкаў у бібліятэках вышэйшых навучальных устаноў замежжа; сумесныя міжнародныя канферэнцыі па праблемах агульных даследаванняў ("Польская кніга і чытач у Беларусі", "Беларуская кніга і чытач у Польшчы"); выступленні з лекцыямі ва універсітэтах замежных краін, шматлікія публікацыі ў замежным друку.

Пачынаючы з 1981 г. выкладчыкі працуюць у межах комплексных даследаванняў кафедры, якія ахопліваюць розныя перыяды існавання і развіцця бібліятэк. Цікавым уяўляецца даследаванне "Развіццё бібліятэчнай справы ў Беларусі" (1981–1985).

У выніку распрацоўкі тэмы "Бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва Беларускай ССР (1986–1990)" вызначаны сацыяльная місія масавай бібліятэкі, яе функцыі і дзейнасць ва ўмовах палітычнага плюралізму, уплыў на духоўнае развіццё моладзі. Звернута ўвага на ўкараненне інавацыйных формаў і метадаў абслугоўвання насельніцтва, даследаваны пытанні дзейнасці бібліятэкі.

У сувязі з актывізацыяй міжнацыянальных зносін члены кафедры сумесна з калегамі Варшаўскага універсітэта (Польшча) распрацавалі методыку і падыходы да даследавання чытання польскай кнігі ў Беларусі і беларускай кнігі ў Польшчы. У выніку была вылучана тэма даследавання "Кніга і чытанне ў сістэме міжнацыянальных зносін" (1991–1994), а таксама праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя ў Польшчы (Яблонна), на якой з дакладамі выступілі У.А.Акуліч, Л.А.Дзямешка, Н.У.Клімянкова, Н.А.Ляйко. Матэрыялы апублікаваны ў Польшчы [3].

З 1995 г. па 2000 г. выкладчыкі кафедры працавалі над тэмай "Гісторыя і сучасны стан бібліятэчнай справы ў Беларусі". Матэрыялы навукова-даследчай работы па гэтай тэме дэпаніраваны ў БелІСА. Рукапіс навукова-даследчай працы кафедры па тэме "Фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і іх кадравага патэнцыялу: гісторыя, сучаснасць" (2000–2005) таксама дэпаніраваны ў БелІСА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, з 1981 г. па 2005 г. праведзены пяць комплексных даследаванняў, якія характарызуюцца пашырэннем сферы навукова-даследчых і вучэбна-метадычных інтарэсаў.

У 2003 г. кафедра бібліятэказнаўства перайменавана ў кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, а бібліятэчны факультэт – у факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Набыццё новага статусу кафедры з’явілася адэкватнай рэакцыяй на новыя сацыяльна-культурныя парадыгмы развіцця бібліятэчнай справы, на бягучыя патрэбнасці айчыннай бібліятэчнай практыкі, звязаныя з неабходнасцю падрыхтоўкі спецыялістаў, якія валодаюць грунтоўнымі ведамі ў сферы менеджменту бібліятэчнай справы.

Выкладчыкамі распрацавана сістэмная канцэпцыя базавай падрыхтоўкі студэнтаў адпаведнай кваліфікацыі з уключэннем цыкла інавацыйных курсаў; прадугледжаны спецыяльныя курсы (дысцыпліны спецыялізацыі). Фундаментальная частка профільнай падрыхтоўкі рэалізуецца праз распрацоўку і выкладанне новых дысцыплін і выданне вучэбных дапаможнікаў новага пакалення [4].

Значна пашырыць кола нацыянальных выданняў нашай краіны і запоўніць істотны прабел у недахопе вучэбных і метадычных матэрыялаў дазваляе ўдзел выкладчыкаў у рэалізацыі праекта “Прафесіяналам бібліятэчнай справы”, ініцыіраванага бібліятэкай Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў і выдавецтвам “Новое знание”. У 2008–2009 гг. выйшлі з друку навукова-практычныя дапаможнікі “Правовое обеспечение деятельности библиотек Республики Беларусь” (аўтар Ю.М.Галкоўская), “Менеджмент школьной библиотеки” (аўтар Л.А.Дзямешка), “Формирование кадровых ресурсов библиотек в новой информационной среде” (аўтар І.Б.Стралкова), “Падрыхтоўка бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэкамі” (аўтар С.В.Зыгмантовіч).

Кафедра працягвае распрацоўку комплексных навукова-даследчых тэм. У 2006 г. была зацверджана чарговая тэма “Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне”, над якой працуюць члены кафедры, аспіранты, магістранты, суіскальнікі, студэнты. Навуковым кіраўніком тэмы прызначана загадчык кафедры кандыдат педагагічных навук, дацэнт С.В.Зыгмантовіч.

У планах кафедры – комплексная распрацоўка пытанняў бібліятэчнай педагогікі, фарміраванне навуковай школы ў межах

гэтага напрамку, падрыхтоўка вучэбных, практычных выданняў як для студэнтаў, так і для бібліятэчных спецыялістаў краіны.

---

1. *Симановский, И.Б.* Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И.Б.Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР. – М.: Гос. б-ка СССР им. В.И.Ленина, 1958. – С. 191–286.

2. *Леончиков, В.Е.* Русско-белорусский словарь библиотечных и библиографических терминов / В.Е.Леончиков, Л.А.Демешко. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1992. – 131 с.; *Лявончыкаў, В.Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя. – Мн.: Вышэйш. шк., 2003. – 223 с.

3. *Ksiazka* i czytelnik w grupach etnicznych. – Warszawa, 1991. – S. 91–129.

4. *Зыгмантовiч, С.В.* Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці / С.В.Зыгмантовіч. – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.; *Зыгмантовiч, С.В.* Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэк / С.В.Зыгмантовіч. – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2009. – 150 с.; *Дзямешка, Л.А.* Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк / Л.А.Дзямешка, С.А.Паўлава. – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2007. – 110 с.; *Паўлава, С.А.* Уводзіны ў спецыяльнасць: метад. дапам. / С.А.Паўлава. – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2009. – 55 с.; *Пераверзева, Ю.А.* Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэб.-метад. дапам. / Ю.А.Пераверзева. – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2009. – 113 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ